ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 112 (1361) ПАНЯДЗЕЛАК, 18 мая 1931 г.

Бурліва расьце рэволюцыйны рух у фашысцкай Польшчы

...чуванымі зьверствамі, жудаснымі распpавамі, арыштамі, масавымі забойствамі,—польскі фашызм імкнецца ўтрымаць сваю ўладу ў Заходняй Беларусі

Тысячы рабочых Польшчы застаюцца бяз хлеба!

...фашысцкай Польшчы право... ...ца пагалоўнае скарачэньне зар... ...ты на 15-40 проц. ва ўсіх га... ...х вытворчасьці. Рабочы дзень ...лічаны да 14-16 гадзін у суткі.

...паасобных галінах прамысло... ...ьці павялічваецца лік закрытых ...дпрыемстваў: у будаўнічай пра... ...словасьці 225 прадпрыемстваў ...рыта, у мінэральнай—353, у ...стыльнай—207 і г. д.

...Беластоку, Лодзі і іншых га... ...ох ужо амаль уся тэкстыльная ...мысловасьць спынілася. Мэталюр... ...ная прамысловасьць заміраe, або ...жоўваецца мінімумам вытвор... ...ьці. Там, дзе рабочыя яшчэ маюць ...оту, ідзе бесьперапыннае зьні... ...ьне зарплаты як па прыватных, ...і дзяржаўных прадпрыемствах. 337 прадпрыемстваў перапра... ...чай прамысловасьці спынілі сваю ...оту, тысячы рабочых гэтых прад... ...емстваў засталіся бяз хлеба.

За Комуністычнай партыяй Зах. Беларусі ідуць сотні тысяч працоўных гораду і вёскі.

Фашызму ня ўдасца загнаць ў падпольле мільёныя масы, бо самы шалёны тэрор ня ўсілах утрымаць гэтай бурлівай хвалі.

Працоўныя масы Зах. Беларусі ўсё больш пераконваюцца, што адзіны выхад з крызісу—гэта шлях, які паказвае ім Комуністычная партыя, шлях узброенага паўстаньня і дыктатуры пролетарыяту.

У сваім цяжкім геройчным змаганьні працоўныя Зах. Беларусі бачаць моцнага саюзьніка ў працоўных масах СССР і БССР.

Паглыбляецца бязьдоньне паміж двума змагаючыміся лягерамі і (фашызмам і працоўнымі масамі Зах. Беларусі), завастраецца змаганьне паміж дзьвюма клясамі, набліжаецца дзень рашучай бойкі.

В.

Бурліва расьце рэволюцыйны рух на Зах. Беларусі

На Зах. Беларусі адбываюцца ...чуваныя зьверствы апалелага ...ьскага фашызму, жорсткі тэрор, ...рачаны здагэтуль пагром працоў... ...х мас. Тое, што цяпер адбываец... ...на Зах. Беларусі, па лютасьці ...ору, па жудасьці распраў над ...цоўнымі, далёка пераcягнула ся... ...нявечную інквізыцыю.

Азьвярэлыя фашысцкія каты ...няюць пагромы з мэтай разгро... ...нацыянальна-вызваленчага руху, ...згрому рэволюцыйнага руху пра... ...ўных мас, вынішчэньня авангарду ...правадыра гэтага руху—Комуніс... ...чнай партыі.

Тэрор на Зах. Беларусі мае на ...це папярэдзіць рэволюцыйныя ...ступленьні працоўных мас, заму... ...ць, тэрорызаваць працоўныя ма... ..., прымусіць іх маўчаць, а больш ...спакойных кінуць за турэмныя ...аты, кінуць жывымі гніць, каб ...ціхамірыць рэволюцыйны рух. Няма бадай ніводнае вёскі на ... Беларусі, у якую не наведвалі... ...-б паліцыя і фашысцкія банды, ...е б ня быў-бы ўчынена пагром.

Польскія фашысцкія прахвосты ...ызнаюць толькі адну мову, мову ...ыбеніцы і астрогу.

З кожным днём памацняецца тэ...р, з кожным днём расьце і павялічваецца да нячуваных памераў ...рывавы сьпіс фашысцкай сваволі. ...слоўнай прычынай гэтага зьяўляецца паглыбленьне экономічнага і ...олітычнага крызісу ў Польшчы, ...кі пагражае экономічнай катастро...ай, і бурны рост рэволюцыйнага ...уху.

Польскі фашызм прагне агнём і ...ечам не дапусьціць да рэволюцый...ага разьвіцьця крызісу.

Пры дапамозе астрогаў і сва...ольства польскія азьвярэлыя моп...ы хочуць утрымаць сваю ўладу на ...ах. Беларусі.

Фашызм на гэты раз памыляецца ...сваіх разьліках: занадта моцная ...янавісьць да фашызму, занадта глыбокія пакуты працоўных мас Зах. Беларусі пад польскім бізуном, занадта бурліва расьце рэволюцыйны рух на окупаваных абшарах.

У некалькі радкоў...

— У Вэнгрыі паліцыя забараніла жанчынам насіць чырвоныя сукенкі, пад выглядам таго, што чырвоны колер зьяўляецца нацыянальным сьцягам Саветаў і нашэньне жанчынамі чырвоных сукенках азначае скрытую дэмонстрацыю за савецкую ўладу. Забарона насіць чырвоныя сукенкі зроблена нібыта з мэтай абароны дзяржаўнага парадку.

— Дзьвінскі ваенны суд разгледзіў справу на абвінавачваньню салдата Гердзіна ў распаўсюджваньні сярод салдат комуністычных адозваў. Гердзін прыгавораны да пазбаўленьня волі ў крэпасьці на паўтара гады.

— У Цэўце (Гішпанскае Марокко) ў сувязі з хваляваньнямі абвешчан стан аблогі.

— У Суолахце выкрыта фашысцкая провокацыйная організацыя, якая ставіла сабе за мэту дыскрэдытацыю комуністычнага руху і правакаваньне рабочых на разрозьненыя выступленьні, каб стварыць прадлог для распраў з рэволюцыйнымі рабочымі і настроіць грамадзкую думку на карысьць фашысцкага руху.

— Рост беспрацоўя ў Нямеччыне працягваецца. Паступленьне прамысловых заказаў панізілася і няма падстаў чакаць палепшаньняў.

Попыт на прадметы першай неабходнасьці, у выніку зьніжэньня накупной здольнасьці працоўнага насельніцтва, працягвае скарочвацца.

— Галава Кантонскага ўраду Чэн-Цзі-Тан задушыў паўстаньне ваенных частак у Кантоне і захапіў амуніцыю, пакінутую ў крэпасьці Гуанноа генэралам Чэн-Мэн-сю (староньнік Чан-Кай-Шы).

— У Гуандуне і Гуансі адбываюцца дэмонстрацыі супроць Чан-Кай-Шы. У сувязі з тым, што чакаецца ўспышка новай вайны, курс дзяржаўных папер безупынна падае.

— У мінулы тыдзень каля Кантону, на суднах, пасланых для барацьбы з комуністычнымі атрадамі, выбухла паўстаньне. Паўстанцы забілі офіцэраў. Паўстаньне было хутка ліквідавана. У раёне Сватоу зноў зьявіліся ў вялікай колькасьці атрады Чырвонай арміі.

...ЯК МНОГА ВАШАЙ ЭНЭРГІІ ЎЦІСНУТА Ў КОЖНЫ РУБЕЛЬ...

Дазвольце агарчыць! Дарагія таварышы! Мне стукнула 63 гады. Вельмі сумняваюся ў тым, што гэта—сьвята. Я лічыў-бы за лепшае мець 36 год. Гэта дало-б мне магчымасьць працаваць рука ў руку з вамі яшчэ гадоў 20, але вы аднесьліся да невясёлага факту маёй старасьці як-бы да сьвята і прыслалі мне некалькі дзесяткаў шматслоўтэлеграм. Разумеецца я вельмі крануты вашай увагай, і павінен дзякаваць вас. Але, падлічыўшы кошт вашых тэлеграм, я знайшоў, што яна правышае 3 тысячы рублёў.

Таварышы! Я добра ведаю, як дорага каштуюць вашыя рабочыя грошы, як многа вашай энэргіі ўціснута ў кожны рубель. Мне здаецца, таварышы, што недарэчна траціць валюту на перасылку за граніцу добрых слоў, калі ў нас дома не хапае валюты на множства добрых спраў. Відома, 3 тысячы рублёў—нічэмная сума для дзяржавы, дзе рабочыя і сяляне затрацілі ў бягучым годзе амаль 20 мільярдаў на організацыю сваёй гаспадаркі. Але ўсё-ж на 3 тысячы рублёў можна было-б організаваць тры вельмі ядрэнныя бібліотэкі ў колгасах, ці забясьпечыць некалькі школ паперай, алоўкамі, або зрабіць яшчэ што-колечы грамадзка-карыснае, напрыклад,—пабудаваць ясьлі для дзіцятак.

Вы не крыўдзіцеся на мяне, ня думайце: „які няўдзячны стары“! Я шчыра дзякую вас, дзякую ўжо за тое, што вы існуеце і жыць з вамі—вельмі добра. А ўсё-ж такі скажу: калі вам ў 1932 годзе захочацца пасылаць мне віншавальныя тэлеграмы, устрымайцеся да бескарыснай траты вашых грошай, нейдзеце ім прымяненьне больш грамадзка-карыснае.

Прывітаньне! І да-хуткага пабачэньня!
М. Горкі
6-га мая 1931 г. Сорэнто

Клясавы вораг перад пролетарскім судом

Ужо другі дзень ідзе працэс над контррэволюцыйнай нагінай выхадзкай антысэмітаў ў Віцебскай школе ФЗВ краўцоў.

Тав. Шубік агалашае прыбыўшы ў распараджэньне суда дакумант наступнага зьместу;

„Антысэміт Міхеенка зьяўляецца не сынам бядняка, як гэта было ўказана у раней прадстаўленай даведцы, а сынам заможнага серадняка, аб чым і даводзіцца да ведама суда“.

Бесчалавечыя зьдзекі—мэтод антысэмітаў

Суд пераходзіць да спрэчак бакоў. Слова мае грамадзкі абвінаваўца—тав. Чучко.

— Яўныя антысэміцкія зьдзекі знайшлі цёплы прытулак у інтэрнаце ФЗВ.

У твар яўрэйскіх дзяцей кідалі бруднымі скарынкамі, прывязвалі да ложка і зьбівалі у час сна, пагражалі нажом, стараючыся выжыць з інтэрнату, прымушалі мыцца зімою ў голым выглядзе, сьцягвалі з ложка і перакідалі наччу матрацы, засоўвалі ногі у маленькі чамаданчык скручваючы рукі білі палкай па галаве—сыстэматычныя зьдзекі і пагрозы, п'янка і карты вось мэтоды „дзейнасьці“ варожай антысэміцкай шасьцёркі: Міхеенкі, Марцінкевіча, Шацько, Сявіцкага, Ганчарова і Міхайлава.

Міхеенка—адзін з ініцыятараў і галоўка гэтай шайкі антысэмітаў—першы пачаў выжываньне з інтэрнату і зьдзекі над яўрэйскімі дзецьмі. Рукамі Міхеенкі яўрэйскія вучні як Цёмкін, прывязваліся да ложка і у час сна зьбіваліся. Ён абкручваў насы і твары яўрэйскіх дзяцей бруднымі парцянкамі, кідаў у іх агрызкамі, пісаў розныя брудныя пісулькі. Ён зьдзекваўся над Біндманам і Гутманам. Гутмана ён біў у лоб пакуль лоб не апухаў і і Гутман ня меў ўжо сілы больш плакаць.

Твар антысэмітаў

Міхеенка далёк ад рабочай ідэолёгіі. Сам ён—кулацкі падпявала. Бацькі яго—заможныя сяляне—пісалі Міхеенку контррэволюцыйныя лісты, якія знаходзяцца зараз у распараджэньні суда. Яны пісалі: „Зараз адымаюць зямлю, на вёсцы жыць стала немагчыма, савецкая ўлада пачынае рабаваць гаспадарку“. Міхеенка—клясава чужы элемэнт, выпадкова папаўшы у ФЗВ.

Ганчароў не ўступае Міхеенку. Ганчароў казаў яўрэйскім дзецям: „Тэрмін вашага прабываньня ў інтэрнаце закончыўся“. Ён забараніў ім гаварыць па-яўрэйску, перадражніваў іх гутарку, прымушаў на марозе мыць падлогу.—„Маўчыце, а то я вам зараз разаб'ю хары“,—так заяўляў Ганчароў, калі чуў яўрэйскую гаворку. На вытворчасьці Ганчароў быў злосным прагульшчыкам.

Марцінкевіч—разлажыўшыся элемэнт- кваліфікаваны карцёжнік, агідны хуліган—меў вельмі вялікі уплыў на весь інтэрнат. Марцінкевіч кіраваў адкрытай п'янкаю і гульнёю ў карты. Ён зьбіў палкай па галаве вучня Біндмана, які пасьля гэтага доўга хварэў. Марцінкевіч агітаваў супроць пазыкі і мерапрыемстваў Савецкай улады. Гэтая тройка—Міхеенка, Ганчароў і Марцінкевіч—уцягвала у карты, п'янку і антысэміцкія зьдзекі астатніх.

Шацько пачаў першым пагражаць яўрэйскім дзецям нажом, забараняў ім гутаркі па-яўрэйску. Ён першым выступіў супроць усяленьня яўрэйскіх дзяцей у інтэрнат, парваўшы загад адміністрацыі.

Ня менш агідную ролю ігралі ў інтэрнаце падсудныя Сявіцкі і Міхайлаў. Яны садзейнічалі і прымалі самі непасрэдны ўдзел у сыстэматычных антысэміцкіх зьдзеках.

Прысуд савецкай грамадзкасьці

Усе абвінавачаныя (Міхеенка, Ганчароў, Марцінкевіч, Шацько, Сявіцкі і Міхайлаў) у апошніх сваіх словах спасылаліся на тое, што у інтэрнаце ня было інтэрнацыянальнага выхаваньня, што яшчэ да іх ў ФЗВ было 30 фактаў антысэмітызму і шовінізму, у якіх замешаны амаль усе інструктары ФЗВ. Падсудныя падкрэсьлівалі, што адміністрацыя, у асобе Клубнана і Рыўкіна, злачынна адносілася да інтэрнату і за ўвесь час яго існаваньня была там толькі два разы.

Тав. Шубік агалашае прысуд.:

Міхеенку, як галоўнага ініцыятара і організатара антысэміцкай шайкі і бязьлітасных зьдзекаў, як чужы клясава элемэнт, прымаючы пад увагу яго першую падсуднасьць і маладасьць,—прысудзіць на два гады зьняволеньня, без паражэньня ў правах.

Ганчарова, як першы раз судзімага і маладога—на паўтара гады, без паражэньня ў правах.

Кваліфікаванага карцёжніка і вядомага шулера Марцінкевіча—на паўтара гады зьняволеньня.

Шацько, як аднаго з актыўных удзельнікаў антысэміцкіх зьдзекаў—на паўтара гады.

Міхайлава і Сявіцкага, як менш актыўных удзельнікаў антысэміцкіх учынкаў—на год зьняволеньня, без паражэньня ў правах.

Уся заля сустракае пастанову суда бурнымі воплескамі.

Лік.

Протэст супроць тэрору ў Зах. Беларусі і Украіне

Комсамольскі сход ячэйкі „Пролетары“ (Бягомльскі раён) сумесна з беспартыйнай моладзьдзю далучае свой голас да протэсту працоўных мас Савецкай Беларусі супроць нячуваных зьверстваў польскага азьвярэлага фашызму на Зах. Беларусі і Украіне.

Польскі фашызм вядзе шалёнае наступленьне супроць рэволюцыйнай хвалі на Зах. Беларусі.

Тэрор, забойствы, катаваньні, зьдзекі над палітзьняволенымі і працоўнамі масамі вымагаюць нас яшчэ больш умацніць работу МОПР'у і працу на перавыкананьню ўлянаў соцыялістычнай будоўлі.

Працоўныя Зах. Беларусі—таварышы па зброі, мы запэўніваем вас, што мы ў любую хвіліну дапаможам вам у вашай цяжкай гераічнай барацьбе з польскім фашызмам. Нечалавечнымі зьдзекамі польскім катам ня ўстрымаць рэволюцыйнай хвалі.

Агульны сход заяўляе катам—фашыстам, што зьверскія зьдзекі ня выбавяць іх ад рэволюцыйных выбухаў, ад паўстаньняў працоўных мас.

Няхай жыве рэволюцыйны рух на Зах. Беларусі і Украіне!

Няхай жыве Комуністычная партыя Польшчы!

Няхай жыве Комінтэрн—штаб сусьветнай рэволюцыі!

Камуністычны саюз моладзі Польшчы
(Сэкцыя Камуністычнага Інтэрнацыяналу Моладзі)
Камуністычны саюз моладзі Зах. Беларусі

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

МАНІФЭСТ

Першага Зьезду Камуністычнага Саюзу Моладзі Заходняй Беларусі да ўсёй працоўнай моладзі Заходняй Беларусі.

Маладыя пралетарыі! Маладыя сяляне! Салдаты польскай імпэрыялістычнай арміі!

Жалезная пята капіталістычнай эксплёатацыі нячадна душыць мільёны маладых рабочых і сялян. Рай [illegible]

Жалезная пята капіталістычнай эксплёатацыі нячадна душыць мільёны маладых рабочых і сялян. Рай буржуазнага панаваньня, якому пяюць хвалебныя сьпевы соцыял-фашысцкія і нацыянал-фашысцкія арганізацыі моладзі, зьяўляецца пеклам для юных пролетарыяў, батракоў і сялян, для ўсёй аграмаднай арміі беспрацоўнае моладзі.

Увесь капіталістычны сьвет перажывае цяпер найглыбейшы экономічны крызіс. У корчах гэтага крызісу б'юцца самыя магутнейшыя як Амэрыка, Англія, Францыя, буржуазныя краіны. Гэты крызіс адбіваецца ў Польшчы з асаблівай сілай, размахам і вастрасьцю. Гарады, мястэчкі і вёскі напоўнены велізарнейшай арміяй беспрацоўных. Сярод мільёнаў беспрацоўных пролетарыяў каля 300.000 выпадае на рабочую моладзь Польшчы, ЗБ і ЗУ. У вёсках Заходняй Беларусі сотні тысяч моладзі ў пошуках працы сустракаюць нэндзу і голад, кабалу кулака і ксяндза, зьверскую эксплёатацыю абшарніка. Рабочы дзень працягваецца пераважна 8-10 гадзін, даходзячы да 14-16 гадзін. Працоўны, яшчэ юныя пролетары падпадаюць пад самую жорсткае прыгнечаньне і эксплёатацыю з боку фабрыкантаў, майстроў і гаспадароў. Заработная плата моладзі—гэта грашы. Моладзь не карыстаецца ніякімі політычнымі правамі.

Вогненная лава белага тэрору

Захопленыя сілаю аружжа землі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны знаходзяцца пад крывавым нацыянальным уціскам польскіх окупантаў. Фашысцкая дыктатура Пілсудзкага не дае школ у роднай мове, зачыняе левыя нацыянальна-вызваленчыя арганізацыі моладзі, конфіскуе рэволюцыйныя выданьні і газэты. Разам з нацыянал-фашыстымі Луцкевічамі-Астроўскімі і пры іх актыўным і непасрэдным падтрыманьні, окупанты разграмілі Віленскую і Навагрудзкую беларускія гімназіі, яны фашызуюць і полёнізуюць беларускую вучнёўскую моладзь. Вогненная лава белага тэрору залівае землі окупаванай Заходняй Беларусі.

Карныя экспэдыцыі на Заходняй Украіне—вось твар фашысцкай Польшчы—гэтай турмы паняволеных народаў. Карныя экспэдыцыі перакідваюцца з Заходняй Украіны на Заходнюю Беларусь і карэнную Польшчу.

У мурох дыфэнзывы драпежнікі капіталізму барбарскімі спосабамі катуюць і зьбіваюць арыштаваную моладзь. У мурох Луцку фашысцкія Зарэмбы—яскравы тып паліцэйскага бандыта сучаснай Польшчы—гвалцілі маладых дзяўчат, наўмысна прышчэплівалі ім вэнэрычныя хваробы, білі маладых рабочых і сялян прутамі па палавых органах, улівалі праз нос ваду, мучылі, зьдзекваліся і катавалі свае ахвяры павольнай сьмерцю. Але Луцк, таварышы, гэта ня выпадак, гэта не адзінкавае зьявішча. Луцк—гэта крывавая сыстэма пануючай дыктатуры фашызму.

Хто з вас, маладыя рабочыя і сяляне, ня ведае ўсіх жахаў беластоцкай, лідзкай, кобрынскай, баранавіцкай і іншых дэфэнзыў! Шмат хто з вас знаходзіліся ў зьверскіх лапах шпікоў. Жорсткім тэрорам, які мяжуе з мэтодамі грамадзянскай вайны, фашызм імкнецца фізычна зьнішчыць рэволюцыйны авангард працоўных—Компартыю і Комсамол.

Савецкі саюз уступіў у пэрыод соцыялізму

Таварышы! У той час, калі ва ўсім буржуазным сьвеце, калі ў фашысцкай Польшчы шалее экономічны крызіс і востра нагаршаецца матар'яльнае становішча працоўных,—ёсьць адна краіна ў сьвеце, дзе няма крызісу, няма беспрацоў'я, дзе ўсьцяж узрастае дабрабыт працоўных мас. Гэтай краінай зьяўляецца наша соцыялістычная бацькаўшчына—Саюз савецкіх соцыялістычных рэспублік, які ўжо пераможна ўступіў у пэрыод соцыялізму. Пяцігодка, якая выклікае столькі лютай нянавісьці ў нашых ворагаў, пасьпяхова выконваецца і будзе выканана ў чатыры гады. На падставе магутнага разгортваньня соцыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і вёсцы, на грунце суцэльнай колектывізацыі сельскае гаспадаркі—ліквідуецца там кулацтва, як кляса—апошняя апора міжнародных імпэрыялістых. У сям'і вызваленых народаў СССР—наша братняя Савецкая Беларусь вялізарнымі крокамі ідзе наперад да соцыялізму. Беларусь, краіна балот, краіна амаль пагалоўнай няпісьменнасьці ў мінулым, краіна адсталай раздробленай сельскай гаспадаркі, ператвараецца ў магутную соцыялістычную краіну, у краіну шпарка ўзрастаючай прамысловасьці, у краіну колектывізуючайся сельскай гаспадаркі, на палёх якой ужо ў гэтую вясну будуць працаваць каля 2.000 трактароў, у краіну ўсеагульнай п'сьменнасьці і росквіту нацыянальнай пролетарскай культуры.

У краіне будуючагася соцыялізму становішча працоўнай моладзі карэнным чынам адрозьніваецца ад вашага становішча. Там няма беспрацоўнай моладзі. Сотні тысяч моладзі кожны год уцягваюцца ў вытворчасьць, вучацца ў тэхнічных школах, школах фабрычна-заводзкага вучнёўства, у вышэйшых навучальных установах. Моладзь раней прыгнечаных народаў будуе сваю культуру, мае свае школы у роднай мове, вылучаецца на пасады адказных кіраўнікоў фабрык і заводаў, саветаў, профэсыянальных саюзаў. З кожным годам павышаецца матар'яльны ўзровень усёй рабоча-сялянскай моладзі СССР і ў прыватнасьці БССР.

Вайна супроць СССР стаіць на парадку дня!

Таварышы! Гэтае пасьпяховае будаўніцтва соцыялізму ў СССР руйнуе сілы гніючага капіталістычнага ладу. Кожны новы камень у будуючымся гмаху соцыялістычнага грамадзтва—гэта дынаміт, які ўзрывае самыя падваліны капіталістычнага панаваньня. Таму буржуазія ўсяго сьвету імкнецца зьнішчыць СССР—вогнішча сусьветнай пролетарскай рэволюцыі, соцыялістычную радзіму прыгнечаных і падняволеных прыгоньнікаў капіталу. У вайне супроць СССР буржуазія імкнецца знайсьці выйсьце з крызісу і заліць у патоках крыві ўздымаючуюся хвалю рэволюцыі ў сваіх уласных краёх. У гэтай вайне міжнародны імпэрыялізм, імкнучыся зьнішчыць уладу пролетарскай дыктатуры, хоча захапіць аграмадныя рынкі СССР, а польскі імпэрыялізм—падняволіць землі Савецкай Беларусі і Украіны і ператварыць іх ў свае калёніі.

Кожны дзень і кожную гадзіну рыхтуецца гэтая новая крывавая бойня.

Польскі фашызм ідзе авангардным атрадам у арміі сусьветніх драпежнікаў, якія рыхтуюцца да антысавецкай вайны. Мільярды дзяржаўнага бюджэту ідуць на ваенныя мэты. Шляхам мілітарызацыі і фашызацыі буржуазія імкнецца ідэолёгічна падпарадкаваць сабе мільённыя масы працоўнай моладзі, распаляючы ў ёй нацыянальную розьнь і нянавісьць да СССР.

Адначасна з гэтым соцыял—і нацыянал-фашысцкія правадыры ППС, Бунду, Луцкевічы—Астроўскія і іх маладзёжныя прыхвасьні з ТУР'у, Цукунфту і іншых супакойваюць вас пацыфісцкімі фразамі, цкуюць СССР і Савецкую Беларусь, распаўсюджваюць брахню аб становішчы працоўнай моладзі ў Савецкім Саюзе.

Таварышы! 1-шы зьезд комсамолу ЗБ зварачваецца да ўсёй працоўнай моладзі Зах. Беларусі з заклікам:

Да рэволюцыйнай барацьбы супроць ваенных плянаў Пілсудзкага—Пуанкарэ і яго соцыял—і нацыянал-фашысцкіх агентаў! У абарону СССР!

За ператварэньне імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую

Да барацьбы супроць мілітарызацыі і фашызацыі моладзі! Ніводнага граша падаткаў на вайну! Далоў ваенныя і напоўваенныя фашысцкія організацыі! Ня будзем выконваць шарваркаў і іншых прымусовых прац на ваенныя патрэбы! Панясем нашы рэволюцыйныя лёзунгі, нашу агітацыю ў масы салдат польскай арміі!

Будзем памятаць вялікія словы Леніна: аружжа, якое дае буржуазія, мы возьмем у свае рукі для таго, каб ім змагацца супроць буржуазіі, супроць генэралаў, фабрыкантаў і абшарнікаў.

Калі польскія і міжнародныя імпэрыялістыя рызыкнуць запаліць пажар новай вайны, калі яны спрабуюць кінуць свае сілы супроць Саветаў, мы адкажам на гэта заклікам да грамадзянскай вайны, мы кінем усе нашы сілы на актыўную і непасрэдную дапамогу Чырвонай арміі, на організацыю шырачэзных мас моладзі для актыўнай барацьбы.

Таварышы салдаты польскай арміі! Станавецеся ў рады рэволюцыйных змагароў, выступайце на барацьбу супроць соцыяльнага і нацыянальнага ўціску, супроць палачнай дысцыпліны, за лепшую ежу, за 8-гадзінную службу, за дапамогу вашым бацьком, маткам, братом і сёстрам, выступайце супроць выкарыстоўваньня вас для барацьбы з рабочымі і сялянамі ЗБ, ЗУ і Польшчы. Організуйце комуністычныя ячэйкі ўнутры арміі. На выпадак вайны—скіруйце сваё аружжа супроць офіцэраў і генэралаў, абшарнікаў і капіталістых! Чырвоная армія—наша армія, армія міжнароднага пролетарыяту, армія пролетарскай рэволюцыі. У часе вайны—

пераходзьце масамі з аружжам у руках на бок Чырвонай арміі! Пераходзьце на бок паўстаўшых рабочых і сялян! Уздымайце сьцяг грамадзянскай вайны—сьцяг рэволюцыі!

Працоўная моладзь, якая ідзе ў армію! Вас фашызм рыхтуе на гарматнае мяса ў вайне супроць СССР. Да вас зьвяртаецца 1 зьезд КСМ ЗБ з заклікам—выступіць пад кіраўніцтвам комсамолу на барацьбу за вашы дамаганьні, за дапамогу вашым сем'ям на ўвесь час вашай службы ў арміі, за вызваленьне іх ад падаткаў, за скарачэньне тэрміну службы, за адбываньне службы ў бліжэйшым горадзе. Дзеля барацьбы за вашыя дамаганьні стварайце групы пабаровых, стварайце рэволюцыйны саюз пабароўцаў, організуйце сходы, мітынгі, дэмонстрацыі.

Зброю, якую вам буржуазія дасьць для вайны з СССР, дзеля задушэньня рэволюцыйнага руху працоўных мас, рыхтуйцеся скіраваць супроць уласных капіталістых і абшарнікаў, супроць офіцэраў і генэралаў і ўсёй фашысцкай дыктатуры.

Адзіны фашысцкі фронт супроць працоўнай моладзі

Таварышы! Польскі фашызм, нясучы на сваіх штыкох новую крывавую бойню, імкнецца адначасна перакласьці ўсе цяжары экономічнага крызісу на на карак працоўных і працоўнай моладзі.

Усе сілы рэакцыі, уся армія фашысцкай контррэволюцыі, фашыстыя і рабіны, правадыры ТУР'у, Цукунфту, дэфэнзыва, Луцкевічы і ППС'аўцы, ксяндзы і шматлікія ваенныя спортыўныя організацыі моладзі „Стралец" і „Гайсак",—усе яны разам, адзіным фронтам, імкнуцца выцягнуць капіталістычную Польшчу з крызісу, усе яны разам імкнуцца ратаваць панаваньне капіталу ад рэволюцыі, усе яны разам вядуць шалёнае наступленьне на мільёны працоўных, на рабоча-сялянскую моладзь.

Бачачы ўпарты і ўсё ўзрастаючы рэволюцыйны рух, бачачы адыход працоўных мас і працоўнай моладзі ад фашызму, соцыял і нацыянал-фашызму, старанныя паслугачы фашысцкай дыктатуры, соцыял і нацыянал-фашысцкія організацыі моладзі, стараюцца разьбіць рэволюцыйную барацьбу маладых рабочых і сялян супроць наступаючага капіталу. Яны ўжываюць „левыя" манэўры дзеля таго, каб ашукаць вас. Яны сьвядома імкнуцца падстаўляць вашу шыю пад удары капіталістых, абшарнікаў і паліцыі.

1 зьезд комсамолу Заходняй Беларусі ясна ўказвае ўсёй працоўнай моладзі адзінае выйсьце з сучаснага крызісу, з сучаснага цяжкага становішча моладзі.

Гэтае выйсьце — у рэволюцыйнай барацьбе, у баявым разгорнутым наступленьні ўсёй працоўнай моладзі разам з рабочай клясай і працоўным сялянствам пад кіраўніцтвам компартыі, супроць наступленьня капіталістых і абшарнікаў і іх фашысцкай дыктатуры. Мы адкрыта і сьмела заяўляем, што Комуністычны Саюз Моладзі ставіць сваёй задачай організаваць пад кіраўніцтвам Компартыі шырачэзныя масы працоўнай моладзі для непрымірымых баёў супроць фашызму, для апошняга і рашучага бою за зваленьне фашысцкай дыктатуры шляхам масавага ўсенароднага ўзброенага паўстаньня.

Наша канчатковая мэта — пролетарская рэволюцыя ва ўсёй Польшчы,

якая нізрыне фашысцкі лад, вырашыць па-рэволюцыйнаму крызіс і ўстановіць на руінах фашысцкай дыктатуры рабоча-сялянскую ўладу, дыктатуру пролетарыяту, Савецкую Польшчу.

Іншага выйсьця няма, іншых шляхоў дзеля вызваленьня ня існуе.

Што дасьць рэволюцыя?

Таварышы! Рэволюцыя дасьць вам, таксама як яна дала ў 1917 годзе працоўнай моладзі СССР, магчымасьць вольнай працы, удзелу ў кіраўніцтве пролетарскай дзяржавай. Яна зьнішчыць сыстэму панаваньня буржуазіі, якая параджае нэндзу, голад, беспрацоўе, безьзямельле і вайну. Рэволюцыя перадасьць фабрыкі ў рукі рабочых і ўстанавіць 7-мігадзінны рабочы дзень для рабочых і 6-цігадзінны для моладзі. Рэволюцыя зьнішчыць нацыянальны ўціск і дасьць магчымасьць самавызначэньня Заходняй Беларусі аж да аддзяленьня. Рэволюцыя перадасьць абшарніцкую, царкоўную і асадніцкую зямлю ў рукі батракоў і сялян бяз выкупу. Рэволюцыя дасьць моладзі працоўную школу ў роднай мове. Рэволюцыя разброіць буржуазію і ўзброіць рабочую клясу і працоўнае сялянства дзеля абароны сваіх заваёў.

Вось наша канчатковая мэта, вось шляхі выйсьця з абцугоў нэндзы, голаду, нацыянальнага уціску і фашысцкага тэрору. Але, каб дасягнуць гэтай мэты, нельга сядзець склаўшы рукі, трэба згуртавацца вакол рэволюцыйнага авангарду — Комсамолу, ісьці ў яго рады і пад яго баявым кіраўніцтвам

біцца за свае штодзённыя інтарэсы. Да рэволюцыйнай барацьбы!

Комсамол заклікае працоўную моладзь да барацьбы за 6-цігадзінны рабочы дзень, за роўную плату, за роўную працу, супроць скарачэньня заробкаў, за дзяржаўную дапамогу беспрацоўнай моладзі гораду і вёскі, за дзяржаўнае соцыяльнае страхаваньне моладзі. Комсамол заклікае вас да барацьбы супроць нацыянальнага ўціску, за школу ў роднай мове, супроць палёнізацыі і мілітарызацыі працоўнай моладзі. Комсамол кліча вас да барацьбы супроць тэрору, за вызваленьне 10.000 рэволюцыйных політвязьняў.

Працоўная моладзь! Дзеля пасьпяховай барацьбы за свае інтарэсы організуйце забастоўкі, прымайце актыўны ўдзел у агульных забастоўках рабочае клясы, уздымайце сьцяг політычнай забастоўкі, організуйце дэмонстрацыі, вясковыя сходы і мітынгі моладзі пад рэволюцыйнымі лёзунгамі комсамолу, організуйце ў вёсцы масавы адпор экзэкутарам і зборчыкам падаткаў. Выступайце супроць соцыял-фашысцкіх правадыроў профсаюзаў, організуйце сэкцыі моладзі пры профсаюзах, стварайце групы профлявіцы моладзі на ўсіх прадпрыемствах, майстэрнях і маёнтках. Абірайце сваіх прадстаўнікоў у фабрычна-заводзкія камітэты і сялянскія камітэты ў вёсках. Стварайце антываенныя камітэты моладзі і рэволюцыйны саюз пабаровых. Стварайце чырвоныя спортыўныя і культурна-асьветныя організацыі, сэкцыі моладзі пры ТБШ і іншых організацыях нацыянальна-вызваленчага руху.

Дзеля барацьбы супроць белага тэрору, дзеля адпору фашысцкім і соцыял-фашысцкім дружыньнікам стварайце на ўсіх прадпрыемствах, маёнтках і вёсках дружыны самаабароны рабоча-сялянскай моладзі. Памятайце, што мэтоды карных экспэдыцый Заходняй Украіны ўсё шырэй стасуюцца да працоўных Заходняй Беларусі і Польшчы. Організуйце баявы адпор ваенна-паліцэйскім бандам, дзе-б яны ні выступалі, на ЗБ, ... альбо Польшчы.

Да барацьбы, да чыннасьці, да шырэньня фронту клясавай барацьбы рабочай і сялянскай моладзі!

Уступайце ў рады Комуністычнага Саюзу Моладзі!

Стварайце ячэйкі комсамолу на ўсіх фабрыках, маёнтках, чыгунач[ных] майстэрнях і вёсках!

За адзінны клясавы рэволюцыйны фронт!

1-шы Зьезд КСМ ЗБ зварочваецца да тэй часткі працоўнай моладзі, я[кая] ідзе яшчэ за ТУР'ам, беларускімі нацыянал-фашыстымі Цукунфтам, „Стр[альцом]", і інш. фашысцкімі соцыял[-] нацыянал-фашысцкімі організацы[ямі]. Таварышы! Вашы правадыры ашук[ваюць] вас, яны рыхтуюць вас для [вай]ны супроць СССР. Яны дапамагаюць Пілсудзкаму трымаць вас у пад[ня]ласьці, яны на кожным кроку з[ры]джваюць вашую барацьбу і разьб[іва]юць адзіны фронт клясавай барацьбы. Дзеля барацьбы супроць наступу [ка]піталу, супроць фашызму і вайны організуйце адзіны рэволюцыйны фронт усёй працоўнай моладзі [пад] кіраўніцтвам комсамолу. Парывайце са сваімі контррэволюцыйнымі пра[ва]дырамі. Выступайце з вашых орга[ні]зацый, далучайцеся да рэволюцыйных організацый моладзі. Толькі пад сьцягам Комсамолу вы зможаце абараняць свае інтарэсы і разам з ім, пад я[го] кіраўніцтвам у супольных радох [рэ]волюцыйнай арміі пролетарыяту [вы] прыдзеце да канчатковай перамогі.

Дзеці працоўных!

1-шы Зьезд КСМ ЗБ зьвяртаецца да вас з заклікам шчыльней згуртавацца на барацьбу супроць уціску фа[б]рыканта, гаспадара і абшарніка, с[у]проць фашысцкай політыкі ў школ[е], супроць касьцёла, царквы і сынагогі. Стварайце ў гарадох і вёсках піонэрскія організацыі, легальныя і напоў[]легальныя гурткі дзяцей. Пад кіраўніцтвам КСМ выступайце за хлеб[,] працу вашым бацьком і маткам, [за] ежу ў школах, за школьныя самаўр[а]ды, за школы ў роднай мове.

Працоўныя дзяўчаты!

На вас з асаблівай сілай падаюць удары капіталістычнага ўціску. Буржуазны лад робіць вас нявольнікам[і] фабрыканта і абшарніка, нявольнікам[і] кухні і непамерна цяжкіх варункаў капіталістычнага быту. Адзіным выйсьцем і для вас зьяўляецца актыўны ўдзел у рэволюцыйнай барацьбе. Скідвайце ярмо рэлігійнай цемры, аполітычнасьці і пасыўнасьці. Уступайце ў рады Комсамолу! Ідзеце ў рэволюцыйныя організацыі моладзі! Вышэй уздымайце сьцяг вызваленчай барацьбы!

Маладыя рабочыя і сяляне Польшчы!

1-шы Зьезд ад імя комсамолу і ўсёй працоўнай моладзі Заходняй Беларусі зварачваецца да вас з гарачым прывітаньнем братэрскай рэволюцыйнай солідарнасьці. Мы заяўляем, што нашу рэволюцыйную барацьбу супроць окупантаў мы вядзем толькі ў самым цесным і неразрыўным саюзе з вамі, толькі пад кіраўніцтвам пролетарыяту Польшчы, яго комуністычнай партыі і комсамолу. Мы ведаем, што толькі рэволюцыя і ўстанаўленьне савецкай улады ва ўсёй Польшчы вызваліць усіх працоўных, у тым ліку і моладзь, ад фашысцкага панаваньня і дасьць магчымасьць Заходняй Беларусі самавызначэньня аж да аддзяленьня ад Польшчы

Таварышы, сябры комсамолу Заходняй Беларусі!

1-шы зьезд КСМ ЗБ паставіў перад саюзам вялічэзнай важнасьці гістарычныя задачы. Гэтыя задачы заключаюцца ў тым, каб комсамол здолеў скіраваць усю сваю організацыю да працы ў масах, да організацыі мас моладзі для рэволюцыйнай барацьбы. Мы не баімся заявіць, што гэтую задачу да гэтага часу мы не змаглі выканаць у дастатковай меры. 1-шы зьезд КСМ ЗБ павінен стаць пераломным момантам у гісторыі нашага саюзу. Маючы за сабой слаўныя баявыя традыцыі, мы зможам зьдзейсьніць пераварот, зможам пайсьці ў масы рабоча-сялянскай моладзі, разам з масамі і на чале іх, баявымі тэмпамі крочыць да новых клясавых баёў.

Кожны комсамолец—за выкананьне рашэньняў зьезду! Кожная ячэйка—за працу ў масах! На фаб-

ДАЦЬ СОТНІ КОМСАМОЛЬЦАЎ-ПАЛЕЕСАЎ ТРЭЦЯМУ РАШАЮЧАМУ ГОДУ

Сэктар рацыяналізацыі ВСНГБ не забясьпечвае правільнае кіраўніцтва рацыяналізатарскім рухам шырокіх працоўных мас

Скарыстаць вопыт лепшых, змагацца за рацыяналізацыю вытворчасьці, за прамфінплян, за якасьць

...эалізаваць вынаходзтва тав. Палееса

Яшчэ зусім нядаўна скончыў сваю ...лу 1-ы ўсебеларускі рацыяналізатарскі зьезд,—зьезд перадавікоў ...дыялістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці.

Прайшоў зусім кароткі час.

Але многія ўжо пасьпелі забыцца ... важнасьці барацьбы за соцыялістычную рацыяналізацыю, аб задачах, ускладзеных на ўдзельнікаў рацыяналізатараў.

Комсамолец Палеес ужо даўно скончыў ФЗВ друкароў і зараз працуе майстрам у школе ФЗВ пры ...друкарні імя Сталіна.

Школа ФЗВ дала добрыя веды, ...атхніла жаданьнем змагацца за палепшаньне вытворчасьці.

І зараз, калі машыны даюць ...рэнныя адбіткі, калі дубовыя калодкі, якія падбіваюцца пад кліша, не апраўдваюцца ў працы,—ён шукае выйсьця і прапануе новы матэр'ял, які павінен замяніць дубовыя калодкі, палепшыць якасьць друку і даць вытворчасьці вялікую эканомію.

Ён складае чарцяжы і разьлікі, якія перадае ў рацыяналізатарскае бюро. Але вынікаў няма.

На паперы зьбіраецца шмат пылу. Пры друкаваньні псуецца машына і адбіткі выходзяць брудныя, нязграбныя.

І тут тав. Палеес прапануе ўстанавіць спэцыяльныя шчоткі для ачысткі паперы. Гэтым самым павінна палепшыцца якасьць продукцыі і зьнішчыцца брак.

Прапанова яго ўпала ў рацыяналізатарскае бюро. Лёс яе спаткаў лепшы, чымся папярэдню. Рацыяналізатарскае бюро ўхваліла, прыняло і парадзіла для ажыцьцяўленьня загадчыку гаспадаркі Гобарману.

Але апошні, замест хуткага ажыцьцяўленьня каштоўнай прапановы, высунуў новую тэорыю:

Мы так працавалі раней, так будзем працаваць і зараз...

Такім чынам, каштоўныя рацыяналізатарскія прапановы натыкаюцца



на сыстэму грубога нежаданьня і ігнараваньня.

Прапановы тав. Палееса павінны быць як мага хутчэй ажыцьцёўлены. Галавацяпскім адносінам да гэтай справы неабходна пакласьці канец.

Л. Г-р.

Калі няма дырэктара...

Стварыць умовы для масавага разгортваньня рацыяналізатарскага руху

Група „лёгкай кавалерыі" пры комсамольскай ячэйцы ВСНГБ арганізавала налёт на сэктар рацыяналізацыі ВСНГБ, завод „Комунар" і фабрыку „Кастрычнік" з мэтай выявіць як пастаўлена кіраўніцтва рацыяналізацыяй і вынаходзтвам, які ўдзел прымаюць комсамольскія організацыі ў разгортваньні тэхнічнай вучобы сярод рабочай моладзі.

Група высьветліла што:

Сэктар рацыяналізацыі ВСНГБ для ажыцьцяўленьня пастановы ЦКК УсеКП(б) даў аб'яднаньням і прадпрыемствам рад дырэктыў і прапаноў, але да гэтага часу не праведзены ў жыцьцё як выканаваны раней дадзеныя дырэктывы.

Па сучаснай сыстэме прапановы і вынаходзтвы разглядаюцца выключ на заводзкімі БРЫЗАМІ і толькі ў тым выпадку, калі няма экспэртызы,—у аб'яднаньні і ВСНГБ.

Такім чынам, ВСНГБ, які павінен быць у цеснай сувязі з БРЫЗАМІ, на справе гэтай сувязі ня мае. Вучут паступаючых і праведзеных у жыцьцё прапаноў і вынаходзтваў не вядзецца. Паездак на прадпрыемствы для ўзмацненьня сувязі і азнаямленьня з работай таксама ня было.

Ня лепш справа і ў аб'яднаньнях. Зьлёты вынаходцаў не практыкаваліся, праверкі працы БРЫЗАЎ ня было, справаздач у аб'яднаньнях ВСНГБ не заслухоўвалі.

На прадпрыемствах спэцыяльных тэхнічных гурткоў для вынахадцаў няма. Яшчэ па сёньня невядома, хто павінен кіраваць гэтым рухам: ВСНГБ ці ЦСПСБ.

Такім чынам ствараюцца ўсе ўмовы для нерэагаваньня на рабочыя прапановы, для бюрократычных адносін да іх.

Ужо сабралася багата прыкладаў ганебнай цеганіны.

Тав. Цяўлоўскі вынайшоў „дыскавую шаткоўку". Гэта вынаходзтва паслалі ў іспытальную станцыю, якая адказала, што ня будзе разглядаць вынаходзтва, бо няма дырэктара.. І толькі пасьля скаргі ў РСІ за некалькі месяцаў вынаходзтва разгледзелі.

Тав. Бэйлін—вынаходца „дзельных галовак". Даслаў вынаходзтва ў Мэтальаб'яднаньне. Экспэртная камісія, пасьля разгляду паслала ў ВСНГБ акт аб тым, што вынаходзтва можа ўжывацца толькі ў рамонтных майстэрнях, а не на буйных заводах. І гэта ў той час, калі на заводах Белмэтальаб'яднаньня ёсьць рамонтныя брыгады і цэхі, якім неабходна скарыстаць гэта вынаходзтва.

Падобных прыкладаў бясчынных адносін да рэалізацыі рабочых вынаходзтваў багата.

Неабходна спыніць цяганіну ў ажыцьцяўленьні рабочых прапаноў і стварыць умовы для масавага разгортваньня рацыяналізатарскага руху.

Група „Л. К."

Добры вопыт

Вопыт „пазыкі ідэй"—на ўсе прадпрыемствы БССР

Грамадзкія організацыі Менскай шчотачнай ф-кі для дапамогі рабочаму вынаходзтву выпусьцілі „пазыку ідэй" сярод рабочых ф-кі.

Выпушчана спэцыяльная облігацыя, якая мае два купоны: адзін з іх абразаецца, калі рабочы ўносіць якую-небудзь прапанову, ужо адобраную журыйнай камісіяй (гэтыя камісіі створаны ў кожным цэху), і да канчатковага высьвятленьня эфэктыўнасьці гэтае прапановы рабочы атрымлівае аванс 10-15 рублёў у рахунак сваёй прэміі; другі купон удзельнічае ў выйгрышы пазыкі, першы тыраж якое будзе ў ліпені месяцы, а другі ў канцы году.

Гэтае важнае мерапрыемства добра популярызавана сярод рабочых. У кожным цэху, на двары, у сталовай—усюды вісяць лёзунгі і плякаты, напамінаючы рабочым аб тым, што абавязкова трэба даць прапанову па палепшаньню вытворчасьці.

Адначасова з гэтым вядзецца рашучая барацьба за якасьць. Рабочы ля свайго варштату, у сталоўцы, у клюбе—усюды знаходзіць кавалачкі паперы, дзе таворыцца аб шкоднасьці браку, задаецца пытаньне, што рабочы зрабіў каб зьнішчыць яго і г. д.

Пазыка вельмі цікавіць рабочых. Кожны імкнецца што-небудзь прапанаваць. Вынікі дасягнуты вялікія.

Пазыка была выпушчана 15-га красавіка, а ўжо на першае мая паступіла 38 рабочых прапаноў, з якіх ужо праводзіцца ў жыцьцё каля 18.

„Пазыка ідэй" павінна быць падхоплена ўсімі прадпрыемствамі БССР.

ВОСЬ ТЫЯ, ХТО НЕ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ШЭФАМ УСЕАБУЧА

Зьняць званьне шэфа

Настаўніцкія брыгады, што працавалі ў Рэчыцкім р-не па праверцы стану ўсеагульнага навучаньня, выкрылі нядбайна злачынныя адносіны часткі настаўнікаў некаторых сельсаветаў і праўленьняў колгасаў, а таксама комсамольскіх ячэек да ўсеагульнага навучаньня.

Настаўніца Вялінскай школы **Ліўшыц** пакінула школу без папярэджаньня і зьмены на пяць дзён, і вучні не займаліся. Сельсавет аб гэтых фактах нічога ня ведаў, бо ня цікавіўся пытаньнем усеагульнага навучаньня.

Настаўніца Кобылеўскай школы, **Несьцярок**, у красавіку не працавала 4 дні і ў сакавіку м-цы таксама шмат прапускала.

Надзвычайна дрэнна праходзіць ўсеабуч у **Холміцкім** сельсавеце, у вёсках Левашы і Гарашкова, дзе настаўнікі нядбайна адносяцца да сваёй працы і тым самым садзейнічаюць адсеву вучняў са школы. У вёсках **Калочын** і інш. наведваюць школы толькі 50 проц. запісаўшыхся, у **Веліне**—толькі 4 чалавекі і г. д.

Сельсаветы нядбайна адносяцца да ўсеабучу, ня выконваюць дырэктыў партыі ў гэтай галіне. Старшыня **Падалескага** с-с тав. **Мацюшэнка** адмахваецца ад ўсеабучу.

Некалі займацца ўсеабучам,—кажа ён,—зараз пасеўная кампанія ў разгары.

Сельсаветы і праўленьні колгасаў павінны дапамагаць і кіраваць усеабучам, аднак у Н—Барсуцкай школе першая група, якая складалася з 50 вучняў, разваліласа. Па ўсім раёне нагіядаецца адліў вучняў са школ і лікпунктаў.

Рэчыцкая комсамольская організацыя, як і увесь комсамол, зьяўляецца шэфам усеабучу. Ведаючы аб бясчынствах некаторых настаўнікаў, сельсаветаў і праўленьняў колгасаў комсамол Рэчыцы не змагаўся з імі за бальшавіцкае выкананьне задач усеабучу.

Комсамольскае кіраўніцтва раёну стаяла ў баку ад усеабучу, забылася аб тым, што комсамол—шэф.

Бясчынныя адносіны некаторых організацый раёну да ўсеабучу ня цікавілі шэфа, **комсамольскае кіраўніцтва опортуністычна бязьдзейнічала ў мобілізацыі раённай комсамолі за усеабуч.**

Рэчыцкая комсамолія не апраўдала сябе, як шэф усеабучу. Комсамольскае кіраўніцтва раёну не забясьпечвае мобілізацыі комсамольскай організацыі, каб апраўдаць званьне шэфа. Дзеля гэтага **мы лічым неабходным паставіць пытаньне аб зьняцьці званьня шэфа з Рэчыцкага комсамолу. Хай яны пакажуць на справе, што могуць быць сапраўднымі шэфамі.**

Ц. В.

Бюро ячэйкі—у хвасьце ўдарніцтва

Другая група курсаў па падрыхтоўцы ў тэхнікумы, організаваныя БРК саюзу Сельгасрабочых пры Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі, узялася за вучобу па-ўдарнаму.

Курсанты другога курса склалі соцумову з першай групай. Курсант другой групы, каб узяцца бальшавіцкімі тэмпамі за вучобу, парашылі на агульным сходзе быць выхаднымі толькі праз 10 дзён, гэта значыць устанавіць на час вучобы 10-цідзёнку і яшчэ дадаткова займацца днём (курсы займаюцца толькі ўвечары), бо прамысловасьці вельмі патрэбны кваліфікаваныя кадры.

На гэтым-жа сходзе ўдарнікі-курсанты патрабавалі наладзіць паказ ходу соцспаборніцтва і ўдарніцтва праз чырвоную і чорную дошкі.

На чорную дошку ўжо пасьпелі папасьці, як злосныя прагульшчыкі, 3 курсанты—комсамольцы: Галавач, Гольдзін і Жак.

Ня гледзячы на тое, што ўдарніцтва і соцспаборніцтва разгортваецца, што некаторыя комсамольцы папалі на чорную дошку, бюро комсамольскай ячэйкі не занялося гэтай справай, не паставіла пытаньне аб гэтых комсамольцах.

Бюро комсамольскай ячэйкі яшчэ не стала на чале кіраўніцтва ўдарніцтвам і соцспаборніцтвам на курсах.

Неабходна, не чакаючы хвіліны, наладзіць кіраўніцтва магутным ударніцкім рухам, які разгарнуўся на курсах.

Курсант Бурдо.

Рвачы і лятуны—нашы ворагі

Комсамольскі колектыў Магілеўскага політасьветнага тэхнікуму пабальшавіцкі ўзяўся за падрыхтоўку кадраў пад ідэйным кіраўніцтвам колектыву КП(б)Б. 56 проц. усіх студэнтаў тэхнікуму—комсамольцы. Комсамольцы разгарнулі ўдарніцтва і соцспаборніцтва і змагаюцца за сапраўды новыя політ'асьветныя кадры з марксысцка-ленінскім сьветапоглядам, за актыўных будаўнікоў соцыялізму.

Матар'яльнае забясьпечаньне студэнтаў поўнасьцю адпавядае пастановам вучобы і працы на бальшавіцкія тэмпы. Усе студэнты забясьпечаны стыпэндыяй 40 рублёў у месяц: пасьцельнымі прыладамі, агульна-жыцьцём і г. д.

Але на вялікі жаль у тэхнікум папалі і „гора-комсамольцы", Баравец Уладзімер—прысланы Халопеніцкім РК КП(б)Б, Градовіч Ул—прысланы Бярэзінскім РК ЛКСМБ Кавалёнак Алёза—Капыльскім РК ЛКСМБ, Карасік Р—Гомельскім РК ЛКСМБ, Курылаў Тодар—Плешчаніцкім РК. Якаўлеў—Карамянскім РК ЛКСМБ. Яны уступілі у тэхнікум не для таго, каб атрымаць марксысцка-ленінскае выхаваньне, а „нажыцца"

Зьявіўшыся у тэхнікум, яны занялися рвацтвам. Іх не здавальняе профэсія політ-асьветніка. Якаўлеву не здавальняе харчаваньне. Баравец, пасланы на практычную працу у вёску, замест рашуча праводзіць пролетарска-клясавую лінію у перавыбарах сельсавету, праявіў правы-опортунізм, абараняў заможнікаў і кулакоў даў ім магчымасьць пралезьці у склад сельсавету.

Тойжа самы Баравец прапусьціў два месяцы заняткаў. Пасьля практыкі зьявіўся у тэхнікум, атрымаў стыпэндыю і за практычную працу 130 рублёў і пакінуў тэхнікум.

Курылаў будучы на вёсцы, меў сувязь з кулакамі, высланымі за межы БССР.

Усе гэтыя рвачы,—„комсамольцы", атрымаўшы да 200 рублёў кожны, пакінулі тэхнікум, паляцелі шукаць больш „выгаднае" месца.

Комсамольскі колектыў М. П. А Т. патрабуе ад вышэйадзначаных РК ЛКСМБ у будучым больш ўважліва адносіцца да пасылкі на вучобу комсамольцаў.

Не дапускаць такіх рвачоў у іншыя тэхнікумы.

По даручэньню ячэйкі ЛКСМБ 1-га курсу М. П. А. Т.—Далецкі

...рыкі і заводы! у маёнткі і вёскі! у палкі і дывізіёны!

Паконччым з замкнёнасьцю і сэктанцтвам! Разгорнем рэволюцыйнае спаборніцтва паміж комсамольцамі, ячэйкамі і організацыямі КСМ! Дамо рашучы адпор правым і „левым" ухілам, узброімся правільнай політычнай лініяй, якую зьдзейсьняе наша партыя і на падставе якой працаваў наш Зьезд.

Нас не запалохае тэрор, і юныя, заўсёды задзёрыя, сьмелыя, заўсёды адданыя да канца справе рэволюцыі, комсамольцы Заходняй Беларусі здолеюць стаць лепшым атрадам комсамолу Польшчы і ўсяго КІМ'у. Змагаючыся на адным з адказьнейшых участкаў міжнароднага рэволюцыйнага фронту, КСМ ЗБ будзе высока трымаць сьцяг рэволюцыі.

Шчыльней рады, на новы шлях!
Вышэй юнацкі вольны сьцяг!
Мы—маладняк бунтоўны
Рабочых і сялян.

Таварышы, юныя пролетары і юныя сяляне! Таварышы салдаты польскай арміі! Мы рэволюцыйная моладзь—дзеці голаду і нэндзы, дзеці капіталістычнай эксплёатацыі, зьяўляемся разам з тым і дзецьмі рэволюцыйных барыкад і рэволюцыйных баёў.

Будзем біцца як чэрці супроць фашысцкай дыктатуры!

Няхай жыве Комуністычны Саюз Моладзі

Няхай жыве Комуністычная Партыя!

Няхай жыве Комінтэрн і КІМ!

За пролетарскую рэволюцыю ў Польшчы!

За рабоча-сялянскі савецкі ўрад—пролетарскую дыктатуру!

Першы зьезд Комуністычнага Саюзу Моладзі Заходняй Беларусі.

Красавік, 1931 г.

Дзеці Нямеччыны на фронце клясавай барацьбы.

(XI інтэрнацыянальны дзіцячы тыдзень ад 1-га да 15-га мая)

У гэтым годзе інтэрнацыянальны дзіцячы тыдзень праходзіць у асаблівых абвострыных абставінах, пад знакам

барацьбы супроць фактычнай бясправнасьці,

якая вызіравецца зараз у Нямеччыне. Сотні тысяч пролетарскіх дзяцей ідуць у школу без сьнеданьня, сячы забыліся, што такое значыць гарачы абед, сотні тысяч павінны ўжо з самага раньняга ўзросту працаваць, каб дапамагчы сваім бацьком у іх цяжкім жыцьці.

Паход фашысцкага ўраду на зарплату працоўных, на дапамогу беспрацоўным, сададрокаваецца наступленьнем на галодным бюджэты пролетарскіх дзяцей. Для будоўлі новых броненосцаў, для падрыхтоўкі вайны супроць Савецкага Саюзу ў фашысцкай буржуазіі і яе соцыял-фашысцкіх лёкаяў маецца „дастаткова" сродкаў.

ROTE STURMFAHNE

Nieder mit den Severing-Grzesinski

дапамогі галадаючым дзецям пролетарыяту скарочаны да мінімуму ці поўнасьцю ліквідаваны!

Вынікі гэтага „рэжыму эканоміі": усё больш павялічваецца колькасьць хворых ад недаяданьня дзяцей. Так, напрыклад, у Брэслаўлі 62,1 пр. сярод вучняў народных школ, 31,0 пр. сярод вучняў сярэдніх школ і 81,1 пр. сярод вучняў гімназій. У Любэку: 50,8 проц. сярод вучняў народных школ і 78,4 проц. сярод вучняў сярэдніх школ. У Бэрліне і у Франкфурце на-Майне 30 проц. усіх сконьчыўшых школы не былі здольны продаўжаць працаваць. У Хэмніцы было ўстаноўлена, што з 1286 дзяцей не атрымоўвалі: першае сьнеданьне—13 проц., другое—18,5 проц., слабых абеды—16 проц. і слабыя вячэры—10,5 проц. Урад Брунінга сыстэматычна праводзіць сваю „культурную місію"—скарачаць бюджэт народнай асьветы. У Бэрліне 17000 пролетарскіх дзяцей вучацца у бараках! У гэтым годзе зачынены у Бэрліне усе школьныя інтэрнаты! Школьная мэбля разваліваецца,—так-што дзеці калечаць сабе. Усялякія дапамогі дзяцям, у форме бясплатнай дапамогі для вучняў і сьнеданьняў адменены. Скарачаецца колькасьць настаўнікаў, так што ў клясах сядзяць па 50-60 дзяцей. Які ўплыў гэта аказвае на здароўе малакроўных і недахарчаваных пролетарскіх дзяцей, можна сабе лёгка ўявіць.

Вось-што пішуць дзеці аб немецкай школе:

„Усюды бруд!"

„У нас у школе (у горадзе Ландсбэргу) назносныя абставіны.

1. Клясы настолькі перапоўнены, што прышлося ўжыць „качавыя клясы". Ад восьмай (самай малодшай) клясы да пятай клясы маюцца 4 паралельныя клясы, чацьвертая класа мае шэсьць паралельных,—а пачынаючы з трэцяй няма наогул больш паралельных клясаў.

2. Прыбіральні ў школе настолькі брудныя, што мы заўсёды з пачуцьцём пазлівасьцю прыбліжаемся да іх. Як відаць, прыбіральні чысьцяцца толькі адзін раз у годзе, а менавіта, калі павінна прыйсьці камісія аховы здароўя. Дзьверы адсутнічаюць ва ўсіх прыбіральнях, а некаторых зусім залітыя вадой.

Мы патрабуем: увесьці новыя паралельныя клясы, адмяніць „качавыя клясы", гігіенічныя прыбіральні, якія павінны сыстэматычна чысьціцца."

І гэта ў „культурнай" заходняй Эўропе, дзе „адбудова азіятчына і барбарства. Гэта ў бюльвяне „дэмократычнай" Нямеччыне.

Калі да гэтага яшчэ дадаць жахлівую кватэрную патрэбу, якая вымушае дзяцей пролетарыяту цэлымі днямі бываць сярод вуліччага пылу, падаць пад колы аўтомабіляў, а буржуазныя друк ламантуе потым, што „дзеці не ведаюць распарадку вулічнага руху", лык стане ясна, што з сабе ўяўляе „дзяцінства" маладога нямецкага пролетарыя.

Ма'быць хто-небудзь з савецкіх таварышоў дзіцяцтва (хаця гэта і не вершыцца): а куды падзелася ўся „клапатлівасьць" аб падрастаючым пакаленьні, якая так рэклямуецца буржуазнай, асабліва-ж соцыял-фашысцкай прэсай?

Яна існуе. Але для кагоі?!

Буржуазія клапоціцца толькі аб сваім падрастаючым пакаленьні

Для дзяцей буржуазіі будуюцца новыя коледжы, у іх даволі настаўнікаў, бо буржуазія і соцыял-фашысцкія бонзы пасылаюць сваіх дзяцей у прыватныя школы. На дзяцей буржуазіі ні ў малейшай меры не адбіваецца скарачэньне бюджэту, бо дзеці буржуазіі даволі „плотна" кормяцца дома.

На выбарах у 1928 і 1930 годзе на пропагандных аўтомобілях соцыял-фашысты было напісана, што яны будуць галасаваць у рэйхстагу супроць пабудовы броненосца, за бясплатнае харчаваньне пролетарскіх дзяцей. Гэта яны гаварылі. А што яны фактычна рабілі? Галасавалі за пабудову броненосца і супроць бясплатнага харчаваньня пролетарскіх дзяцей! Матывы? Ды пашто соцыял-фашыстым патрэбны матывы! Так загадаў лёкаю яго гаспадар,—і гэта усё ўрэгулявана.

Ці можа сабе ўявіць вольнае дзіця СССР у якіх нямагчымых умовах жыве яго брат у капіталістычным сьвеце наогул і ў Нямеччыне ў прыватнасьці? Ня здзіва, што крывая росту дзіцячага злачынства ідзе няўхільна ўверх. Ясна, што турмы для маладалетніх злачынцаў ні ў якім разе не могуць не равыхоўваць дзіцяці,—наадварот, з гэтых турмаў яно выходзіць ужо як „злачынца" з практыкай. Вось чаму так часты бунты ў так званых „дамах прымусовага выхаваньня"!

Да 14 год дзіцяці ў Нямеччыне забаронена займацца платнай работай,—яно павінна „вучыцца". Але якое ўжо можа быць вучэньне пры пустым страўніку, пры сьвядомасьці, што калі так ці інакш не дастанеш грошай, дык прыдзецца легчы спаць без вячэры і пайсьці ў школу без сьнеданьня! Таму мы спатыкаем на вуліцах Нямеччыны газэтчыкаў—дзяцей, разносчыкаў—дзяцей, ліфт—„боі" у багатых готэлях—гэта галадаючыя дзеці. Тачкі возяць на вуліцах дзеці. Гэта малюнкі, якія можна штодзённа назіраць у „дзіцячым „раі"—у Нямеччыне. Яшчэ горш тое, чаго не відаць. Дзеці эксплётуюцца самым бязьлітасным чынам.

Але дзеці пролетарыяту не маўчаць!

У Гамборне (Рурская вобласьць), жонкі і дзеці беспрацоўных напалі на ратушу, патрабаваўшы работы для сваіх мужоў і бацькоў—і хлеба. Калі паліцыя са стрэльбамі на-перавес напала на галодных пролетарыяў, маткі і дзеці не спалохаліся. Яны крыкнулі: „Страляйце у нас"—тады мы не павінны будзем быць сьведкамі таго, як нашыя дзеці паміраюць з голаду!"

Дзеці пролетарыяту гэтага не забываюць. Ужо з самага раньняга ўзросту яны становяцца змагарамі супроць капіталістычнага наволньніцтва. Гэта відаць хаця-б з таго, якою радасьцю сустракаецца кожнае выступленьне пролетарскіх дзяцей.

З ростам сьвядомасьці пролетарыяту, ён сам пачынае сачыць за выхаваньнем сваіх дзяцей. Няма сёньня такога больш ці менш сьвядомага пролетарыя, які-б не ўяўляў важнасьць арганізацыі пролетарскіх дзяцей. Гэта відаць хаця-б з таго, якою радасьцю сустракаецца кожнае выступленьне пролетарскіх дзяцей перад пролетарскай грамадзкасьцю!

Організацыя пролетарскіх дзяцей у Нямеччыне—гэта

„Юнгспартакус-Бунд" („Саюз маладога спартакаўца")

Гэта організацыя выхоўвае будучых пролетарскіх байцоў ў духу комунізму, прывучае іх быць колектывістымі. Друкаваны орган „Юнгспартакус-бунду" завецца „Ды тромэл" („Барабан"). Як барабан ён заклікае дзяцей да барацьбы за лепшае дзяцінства, за лепшае жыцьцё. Ён па-баявому выхоўвае дзяцей, паказваючы, як жывуць іх маладыя браты ў СССР, навучаючы іх, як трэба змагацца, каб і ў Нямеччыне дасягнуць тое-ж самае.

Клюбаў у нямецкіх піонэраў вельмі мала—няма сродкаў на пабудову іх. Але першыя вопыты—„Дзіцячы клюб імя Леніна" ў рабочым раёне Бэрліна, у Вэддынгу, паказалі, што патрэба ў клюбах вялізарная.

У сувязі з інтэрнацыянальным сьвятам пролетарыяту, Першым мая, баставалі ня толькі рабочыя на фабрыках, але і пролетарскія дзеці ў школах. Гэта прадбачыла галоўным чынам ня толькі фашысцкая, але і соцыял-фашысцкая адміністрацыя школ, У Гамбургу галоўнае кіраўніцтва школамі разаслала спэцыяльны абежнік, у якім прапануе прыняць адпаведныя меры супроць сьвяткаваньня Першага мая і супроць „Інтэрнацыянальнага дзіцячага тыдню".

Паліцыя ня дасьць спакойна прайсьці „тыдню". Факты ўжо ёсьць у наяўнасьці. У Лейпцыгу паліцыя соцыял-фашыстага Флейснэра напала на конфэрэнцыю піонэраў, пасьля таго як ва ўсёй Саксоніі, у царстве „левых" соцыял-фашыстых, забаронены ўсе сходы і дэмонстрацыі ў сувязі з „інтэрнацыянальным дзіцячым тыднем". У другіх гарадох Нямеччыны адбываецца тое-ж самае. На дапамогу паліцыі прыходзіць школьная адміністрацыя, якая выключае са школ і прымае розныя рэпрэсыўныя меры супроць актыўных піонэраў. У сярэдняй Франкіі (Баварыя) адміністрацыя пакінула піонэрку Іду Кафка яшчэ на адзін год у клясе, таму што яна ў часе капікул была ў гасьцёх у піонэраў СССР.

Але і дзяцей рабочае клясы Нямеччыны нельга ўзяць тэрорам!

У дні „міжнароднага дзіцячага тыдню" яны пад рознымі выглядамі дэманстравалі ва ўсёй Нямеччыне

за лепшае дзяцінства, за лепшую будучыню!!

І яны, гэтыя храбрыя дзеці баявога нямецкага пролетарыяту, будуць і ў далейшым ў першых радох рэволюцыйнага пролетарыяту,—пакуль мы не пераможам!!

А. Прока,

Лейпцыг, 9-га мая 1931 г.

Юнгспартакусбунд

Ліст нашага лейпцыгскага рабкора.

Міжнародны дзіцячы тыдзень—адна з самых важнейшых кампаній „Юнгспартакус-бунду"—піонэрскай організацыі Нямеччыны. Гэты тыдзень дапамагае выхоўваць нашых дзяцей у духу інтэрнацыянальнай солідарнасьці. Але што яшчэ больш важна—гэты тыдзень мобілізуе пролетарскіх дзяцей:

супроць школьнай рэакцыі, супроць фашызму, супроць эксплёатацыі дзіцячай працы

Пад „прыглядам" соцыял-фашысцкіх „культур-трэгераў" растуць як грыбы пасьля дажджу ня толькі соцыял-фашысцкія дзіцячыя організацыі, але і чыста фашысцкія. Самая вялікая з гэтых апошніх—„Дзіцячая організацыя нямецкіх гімнастаў"—ахоплівае каля 350 тысяч дзяцей. Пад сьцягам спорту выхоўваюць тут дзяцей у рэакцыйна-хрысьціянскім духу,—выхоўваюць паслухмяных нявольнікаў, якія патрэбны як гарматнае мяса і як штрэйбрэхеры. Другая па велічыні фашысцкая організацыя дзяцей—гэта „Каталіцкія дзіцячыя групы". Гэта організацыя ахоплівае каля 45 тысяч дзяцей. Ужо адзін той факт, што хлопчыкі і дзяўчынкі організаваны асобна, паказвае абсолютную рэакцыйнасьць гэтай папоўскай організацыі.

Трэцья па велічыні фашысцкая організацыя дзяцей—гэта організацыя „Бой-скаўтаў". Яна ахоплівае каля 25 тысяч дзяцей. Яна мала чым розьніцца ад вышэй азначаных дзьвюх організацый, хіба толькі тым, што яна зварачвае больш увагі на муштроўку,—дый яно і зразумела, бо гэта організацыя рыхтуе „кадры"... для арміі і паліцыі.

Побач з гэтымі яўна фашысцкімі організацыямі, існуе соцыял-фашысцкі саюз дзяцей „Ротэ-Фалькэн" (Чырвоны сокал). Ён ахоплівае 115 тысяч дзяцей. Згодна соцыял-фашысцкага прынцыпу—дзеці не павінны займацца палітыкай,—таму гульні і скокі складаюць галоўную работу гэтай організацыі. Дзеці выхоўваюцца ў чыста буржуазным духу,—з іх павінны зрабіцца будучыя паслухмяныя авечкі соцыял-фашысцкай „ідэолёгіі".

Усе гэтыя організацыі „аполітычны". Яны не толькі легальна працуюць, але атрымоўваюць яшчэ колёсальныя дапамогі з дзяржаўных і комунальных бюджэтаў, бо яны выхоўваюць дзяцей у „дзяржаўным духу"—павінны стварыць „благанадзёжных" грамадзян капіталістычнай дзяржавы.

Гэтым організацыям супрацьстаіць

Чырвоны саюз піонэраў—„Юнгспартакус-бунд"

Гэта організацыя пролетарскіх дзяцей ахоплівае ў сучасны момант 20 тысяч дзяцей

Гэтая організацыя не атрымлівае ніякіх дапамог ад капіталістычнай дзяржавы, бо яна клясавая организацыя пролетарыяту. Наадварот фашысцкі ўрад Нямеччыны лічыць сваім „сьвяшчэнным" доўгам пр[…]ледваць клясавую організацыю д[…]цей пролетарыяту. У Баварыі[…] Вюртэнбергу „Юнгспартакус-бу[…] забаронены і вымушаны працав[…] нелегальна. У Браўншвэйгу і Тур[…]гіі паліцыя сыстэматычна прасл[…]дуе організацыю чырвоных піонэр[…] У гэтых апошніх дзяржавах афі[…]на ўзаконены цялесныя кары, [...] неабходны прадмет выкладае[…] рэлігія. Ва ўсіх гэтых дзяржа[…] піонэры вядуць настойную бара[…]бу—і не палохаюцца рапрэ[…] школьнай рэакцыі. На рэакцыйн[…] законы турынгенскага фашысцк[…] ўраду піонэры адказалі школьн[…] забастоўкай.

Першага мая піонэры прым[…] актыўны ўдзел ва ўсіх рэволюцы[…]ных выступленьнях пролетарыят[…] Асабліва моцнымі калёнамі піонэр[…] дэманстравалі ў Саксоніі.

Лейпцыгская організацыя „Юн[…]спартакус-бунду" у даны мома[…] ахоплівае 800 піонэраў, піонэрск[…] організацыя „Межрабпому"—1[…] піонэраў, і піонэрская організацы[…] бязбожнікаў—300 піонэраў. Апо[…] дзьве організацыі стаяць п[…] кіраўніцтвам „Юнгспартакус-бунду[…] і маюць свае задачы. У вынік[…] соцспаборніцтва было павялічаны колькасьці членаў на 30 проц. [...] сувязі з соцспаборніцтвам усе груп[…] пачалі больш актыўна працава[…] Былі організаваны дзіцячыя раніш[…]нікі, к якім кожны піонэр павіне[…] быў прывесьці адно пролетарска[…] дзіця. Уся програма гэтых раніш[…]каў праводзілася самімі піонэрам[…] і мела вялікі посьпех. Кіраўніцтв[…] піонэрскай організацыяй наладзіл[…] 5 вялікіх мітынгаў, на якіх пры[…]сутнічалі ўсе тры пакаленьні пролетарыяту. 6 піонэрскіх агітпропгру[…] выступілі на гэтых мітынгах і пра[…]вялі добрую агітацыю.

Вялікую ўвагу піонэрская орга[…]нізацыя зьвярнула на работу ў шко[…]лах. Абставіны работы там больш цяжкія, але нашы піонэры не жа[…]даюць прызнаваць перашкод. За ка[…]роткі час былі выпушчаны тр[…] школьныя газэты і ў вялікай коль[…]касьці школ організаваліся „школьныя перадавыя пасты" (організацыя давераных). У хуткім часе в[…] ўсёй Нямеччыне адбудуцца выбары ў бацькоўскія камітэты пры школах. І ў гэтым выпадку працуюц[…] рука ў руку ўсе тры пакаленьні пролетарыяту, што загадзя гарантуе посьпех нашых сьмісаў.

На конфэрэнцыі пролетарскія дзяцей у Лейпцыгу 3-га мая г. г.

сабраліся 127 делегатаў, з іх толькі 40 проц. былі організаваны ў саюз піонэраў—і 172 госьці. На гэтай конфэрэнцыі былі падведзены вынікі праробленай работы. 10 проц. удзельнікаў конфэрэнцыі ўдзельнічала ў спрэчках. У выніку дыскусіі самая вялікая частка неорганізаваных делегатаў уступіла ў піонэрскі саюз. З гэтых новаўступіўшых, 4—былыя члены соцыял-фашысцкай організацыі „Чырвоны сокал". Конфэрэнцыя ўжо падыходзіла к канцу, калі ўварвалася „храбрая" паліцыя соцыял-фашысцкага паліцэй-прэзыдэнта Флейснэра і закрыла конфэрэнцыю. Вельмі позна,—работа конфэрэнцыі была ўжо скончана.

Ня гледзячы на тэрор, ня гледзячы на здрадніцкую палітыку соцыял-фашысцкіх кіраўнікоў „Чырвонага сокала", дзеці нямецкага пролетарыяту яшчэ шчыльней згуртоўваюцца пад чырвонымі сьцягамі „Юнгспартакус-бунду"

Вальтэр Рорляпэр

Лейпцыг, 10-га мая 1931 г.

Конфэрэнцыя паходу за рэволюцыйную тэорыю

18-га мая, а 7-й гадз. увечары у памяшканьні клюбу Друкароў адбудзецца 1-шая агульна-гарадзкая конфэрэнцыя па пытаньню паходу за рэволюцыйную тэорыю, з наступным парадкам дня.

1. Аб выніках прамполітбою (дакл. тав Фрумкінай) і далейшыя задачы паходу за рэволюцыйную тэорыю.

2. Аб організацыі прамполітпераклічкі паміж Менскам, Гомелем і Віцебскам.

На конфэрэнцыю запрашаюцца ўсе кіраўнікі політгурткоў, політшкол, апо к-ваў, сэктары вучобы, упаўнаважаныя па друку.

Пасьля ўрачыстага пасяджаньня—мастацкая частка.

Білеты ў Менгаркоме ЛКСМБ з 9-ай гадзіны раніцы да 4-ай гадз. дня.

Культпроп Менгаркому ЛКСМБ Фрумкіна

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўліт'ел № 599